Падтрымай "Вясну" на PATREON

Вылічылі праз год па вопратцы: судзяць яшчэ аднаго ўдзельніка падзей 9 жніўня 2020 года

30.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Яўген Крачкоўскі.

У судзе Заводскага раёна Минска разглядаецца крымінальная справа Яўгенія Крачкоўскага, абвінавачанага ў арганізацыі або актыўным ўдзеле ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак (ч.1 арт. 342 КК РБ). Падзеі тычацца 9 жніўня 2020 года.

Справу разглядае суддзя **Жанна Хвайніцкая**, дзяржабвінавачванне прадстаўляе памочнік пракурора **Валадзько.**

Яўген Вячаслававіч Крачкоўскі - аўтар праекту «АДВЕКУ». Мужчына займаўся пошукам продкаў у Беларусі, генеалагічнымі даследаваннямі, складаннем радаводу, пошукам у архівах, мае непаўнагадове дзіця. Прызнаны палітычным зняволеным.

Яўгена Крачкоўскага затрымалі 8 верасня 2021 года пасля ператрусу ў яго доме. Да суда знаходзіўся пад вартай у СІЗА №1. У момант затрымання супрацоўнікі ГУБАЗіК прымусілі мужчыну запісаць пакаяльнае відэа.

Яго вылічылі па біллінгу ягонага тэлефона, а калі прыйшлі з ператрусам дахаты – знайшлі вопратку, у якой ён быў апрануты 9 жніўня 2020 года і якая была бачна на фотаздымках, дзе ён і яшчэ некалькі чалавек падчас мітынгу на Стэле знаходзіцца на пешаходным пераходзе на дазваляльны сігнал святлафора.

Па матэрыялах абвінавачвання, Крачкоўскі, з групай неўстаноўленых асоб пасля 21 гадзіны ў раёне праспекта Пераможцаў і Варвашэні, груба парушаў грамадскі парадак, стаяў у счэпцы і перашкаджаў руху грамадскага транспарту.

У справе маецца матэрыяльная прэтэнзія прадпрыемства “Мінсктранс” аб нанясенні ўрону ў памеры 3621 рубель і 64 капейкі.

Сваю віну абвінавачаны прызнаў часткова.

Пад час допыту Крачкоўскі патлумачыў, што ў той вечар разам з сябрам з-за цікавасці даехалі да Мельнікайтэ, было шмат народу. Працы транспарту яны не перашкаджалі, вуліцу пераходзілі на зялёнае святло. Таму іск “Мінсктранса” цалкам не прызнае. Праз некалькі гадзін выклікаў таксоўку і паехаў дадому.


Адвакат Аляксей Дравіца звярнуў увагу, што перыяд часу прастою грамадскага транспарта, які ўказаны ў іску “Мінсктранса”, у некалькі разоў перавышае час знаходжання Крачкоўскага на месцы правядзення несанкцыянаванага масавага мерапрыемства.

Суд абвясціў перапынак для ўдакладнення патрабаванняў транспартнікаў.

Наступнае судовае пасяджэнне прызначанае на 10-30 9 лістапада.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВалюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

